РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ
# ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
20 ЖНІЎНЯ 2025 г. СЕРАДА № 159 (30547)




## Тры кіты якасці «БЕЛДЖЫ»

Фота Лізаветы ГОЛАД.

Беларусь паступова і ўпэўнена фарміруе ўласную аўтамабільную прамысловасць, арыентаваную на інавацыі і якасць. Калі яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў таму аўтамабілебудаванне асацыявалася перш за ўсё з цяжкай тэхнікай і грузавікамі, то сёння сітуацыя зусім іншая. Краіна стварыла прадпрыемствы, што выпускаюць канкурэнтаздольныя легкавыя аўтамабілі, якія адпавядаюць сусветным стандартам і запытам пакупнікоў.

Бадай, самы яскравы прыклад — прадпрыемства «БЕЛДЖЫ» і аднайменныя аўто, якія там выпускаюць. На вытворчасці ўсталявана найноўшае абсталяванне, мадэрнізаваны вытворчыя лініі і аптымізаваны тэхналагічныя працэсы. Як вынік — пашыраны мадэльны рад аўтамабіляў, а іх папулярнасць расце не толькі ў Беларусі, але і за яе межамі. Пашырэнне дылерскай сеткі ў сваю чаргу — гэта грунтоўная канкурэнцыя звыклым аўтабрэндам. СТАР. 5

# АДКАЗНАСЦЬ, ДАСКАНАЛАСЦЬ І СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ

ПАТРЫЯТЫЧНЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ БАБРУЙЧАН



Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ISSN 1990 — 763X
25159>

НАПЯРЭДАДНІ

## ДОМ ДАЛЁКА АД ДОМУ

### У якіх умовах будуць жыць студэнты ў сталіцы

У пачатку новага навучальнага года тэма студэнцкіх інтэрнатаў традыцыйна выходзіць на першы план. Міністэрства адукацыі і ВНУ краіны адзначаюць: работа па забеспячэнні студэнтаў месцамі пражывання вядзецца сістэмна, а ўвага ўдзяляецца не толькі колькасці ложкаў-месцаў, але і іх якасці. СТАР. 13



# МІНСК—ТЭГЕРАН: АДКРЫТАСЦЬ ПА ЎСІХ КІРУНКАХ

## Беларуска-іранскія ўзаемаадносіны стануць асноўнай тэмай перагавораў у Палацы Незалежнасці



**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА сёння, 20 жніўня, правядзе ў Мінску перагаворы з Прэзідэнтам Ірана Масудам ПЕЗЕШКІЯНАМ.**

Сустрэча кіраўнікоў дзяржаў пройдзе ў Палацы Незалежнасці ў вузкім і пашыраным фарматах, пасля чаго адбудзецца падпісанне двухбаковых дакументаў, накіраваных на пашырэнне партнёрства дзвюх дзяржаў, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка і Масуд Пезешкіян, як плануецца, абмяркуюць супрацоўніцтва Беларусі і Ірана ў сферах гандлю, інвестыцый і прамысловай кааперацыі, рэалізацыю сумесных ініцыятыў у навуцы, тэхналогіях, адукацыі, а таксама ўзаемадзеянне дзяржаў у рамках міжнародных структур, у тым ліку ЕАЭС, ШАС, БРІКС, ААН.

У цэнтры ўвагі будуць і пытанні забеспячэння рэгіянальнай і міжнароднай бяспекі.

### З гісторыі пытання

## УЗГАДАЛІ, ЯКІЯ БЫЛІ КАНТАКТЫ НА НАЙВЫШЭЙШЫМ І ВЫСОКІМ УЗРОЎНЯХ

Палітычнае супрацоўніцтва Беларусі і Ірана пачало свой адлік з устанаўлення дыпламатычных адносін 18 сакавіка 1993 года. Наша краіна адкрыла сваё пасольства ў Тэгеране 8 сакавіка 1998 года, а пасольства Ірана працуе ў Мінску з лютага 2001 года.

Краіны падтрымліваюць высокі ўзровень палітычных кантактаў. У прыватнасці, адбыліся **тры візіты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у Іран** (**1998**, **2006** і **2023** гады) і два візіты Прэзідэнта Ірана ў Беларусь (**2004** і **2007** гады).

**9 ліпеня 2015 года** на палях самітаў БРІКС і ШАС ва Уфе таксама адбылася сустрэча Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Ісламскай Рэспублікі Іран Хасанам Раўхані.

Кіраўнікі дзяржаў Беларусі і Ірана сустракаліся **9 чэрвеня 2018 года** на саміце ШАС у Ціндаа і **14 лютага 2019 года** ў Сочы разам з прэзідэнтамі Расіі і Турцыі ў рамках трохбаковага саміту па крызісе ў Сірыі.

**16 верасня 2021 года** адбылася сустрэча Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі з Прэзідэнтам Ірана Эбрахімам Раісі на палях саміту ШАС у Душанбэ і 16 верасня 2022 года ў Самаркандзе.

**24 кастрычніка 2024 года** на палях саміту БРІКС у Казані Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Прэзідэнтам Ірана Масудам Пезешкіянам.




Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз павіншаваў калегу з пераканаўчай і бясспрэчнай перамогай на выбарах, вынікі якіх не маглі аспрэчыць нават на Захадзе, і запрасіў наведаць у зручны час Мінск, каб абмеркаваць перспектывы супрацоўніцтва. Тым больш што паміж бакамі ніколі не было закрытых тэм.

Дарэчы, удзел Прэзідэнта Ірана — упершыню ў якасці прадстаўніка дзяржавы-назіральніцы пры ЕАЭС — планаваўся ў пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета ў Мінску, які адбыўся сёлета 27 чэрвеня. Аднак з прычыны пэўных абставін ён не змог прыляцець у беларускую сталіцу.

«Нядаўнія ўдары па ядзерных аб'ектах Ірана, якія знаходзяцца пад кантролем МАГАТЭ, самым небяспечным чынам парушаюць палажэнні міжнароднага права, уключаючы Дагавор аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі і Жэнеўскія канвенцыі 1949 года. Не буду нават казаць пра пачуцці, якія такія дзеянні выклікаюць у Беларусі — краіне, найбольш пацярпелай ад аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі. Тады радыеактыўныя ападкі былі зафіксаваныя нават у Вялікабрытаніі, Германіі і Швецыі. Думаюць, напэўна, што цяпер не накрые, асабліва краіну, якая здзейсніла падобныя дзеянні», — адзначыў тады кіраўнік дзяржавы і пажадаў іранскаму калегу ўсялякіх поспехаў, а народу Ірана — пераадолення ўзніклых праблем. — Я хачу, каб вы ведалі, што ў вашым супрацыве вы не ў адзіноце».

На пасяджэнні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета Аляксандр Лукашэнка таксама выказаў задавальненне ад уступлення ў сілу ў гэтым годзе поўнамаштабнага пагаднення ЕАЭС аб свабодным гандлі з Іранам.

Кантакты падтрымліваліся і на ўзроўні ўрадаў, парламентаў, міністэрстваў і ведамстваў. Дзейнічаюць Міжпарламенцкая група сяброўства Беларусі і Ірана, змешаная беларуска-іранская камісія па пытаннях эканамічнага супрацоўніцтва. Апошняя, 17-я па ліку, дарэчы, адбылася адносна нядаўна — у студзені бягучага года ў Мінску, дзе быў узгоднены план далейшага супрацоўніцтва на 2025 год па перспектыўных кірунках.

У прэамбуле дакумента бакі зафіксавалі яго галоўную мэту: паглыбленне ўсяго комплексу гандлёва-эканамічных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Ісламскай Рэспублікай Іран.

Згодна з пратаколам, прыярытэтнымі задачамі для развіцця гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва вызначаны: рэгулярнае правядзенне пасяджэнняў камісіі; павелічэнне двухбаковага тавараабароту ў мэтах забеспячэння ўсебаковага і ўстойлівага эканамічнага развіцця паміж дзвюма краінамі; пашырэнне дыяпазону ўзаемнага гандлю таварамі і іншыя.

Дакумент уключае ўзаемадзеянне ў 2025 годзе па шырокім спектры кірункаў, у тым ліку ў сферы гандлю і прамысловасці, сельскай гаспадаркі, электраэнергетыкі, транспарту, аховы здароўя, адукацыі, спорту і іншых.

Што датычыцца міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння, пабрацімскія сувязі ўстаноўлены паміж гарадамі-сталіцамі Мінскам і Тэгеранам, Гомельскай вобласцю і правінцыяй Мазендаран, Магілёвам і Тэбрызам.







МЕРКАВАННЕ

# СКРЫЖАВАННЕ ЕЎРАЗІЙСКІХ ДАРОГ

**Тэлефонныя перагаворы Аляксандра Лукашэнкі і Дональда Трампа — вялікая дыпламатычная падзея. Магчыма, з вялікімі эканамічнымі перспектывамі**

Здавалася б, якая глыбокая цікавасць можа быць у далёкага Вашынгтона, з наймагутнейшай эканомікай, у такой невялікай краіне, як Беларусь? Аднак амерыканскі лідар не проста палітык, а прадпрымальнік. Да мозга касцей.
І перспектывы ў нашай краіне ён бачыць. Хоць, магчыма, і не раскрывае ўсе карты на стале складанага пасьянса міжнароднай палітыкі і геаэканомікі — прынамсі, логіка папярэдніх дзеянняў амерыканскай адміністрацыі паказвае, што наша геаграфічнае становішча разам з цалкам прыязнай палітыкай (наколькі гэта ў цэлым магчыма) валодаюць сур'ёзным лагістычным патэнцыялам. А такія праекты вельмі прываблiваюць Белы дом.

Канцэнтрацыя на паслугах і атрыманні прыбытку ад сваёй фінансавай сістэмы некалькі паменшылі вагу Амерыкі ў свеце. Не вельмі гучныя, але досыць настойлівыя меркаванні наконт правалу на міжнароднай арэне гучалі апошнія гадоў дзесяць. На ўзроўні чыноўнікаў (праўда, другога і трэцяга эшалона), а таксама экспертаў гучала прыкрасць і занепакоенасць, што ЗША сышлі або практычна сышлі з эканомік многіх рэгіёнаў: і Паўднёвай Амерыкі, і Карыбскага басейна, і Афрыкі... не тое, каб цалкам спынілі сваю дзейнасць, але ў цэлым многія працэсы пусцілі на самацёк.

Дональд Трамп з палітыкай дэіндустрыялізацыі, фактычна, рэалізуе новы курс. Веліч ЗША ён бачыць, у тым ліку ў развіцці таварнай вытворчасці і актыўным удзеле ў міжнародным гандлі з пункту гледжання рэалізацыі менавіта матэрыяльных каштоўнасцяў: ад энерганосьбітаў — да складаных спажывецкіх тавараў і высокатэхналагічнай прадукцыі. А для гэтага неабходныя не толькі фабрыкі і заводы, але і адпаведная лагістычная інфраструктура. Чым цяпер моцна заклапочаныя амерыканцы? Аднаўленнем сваіх пазіцый у суднабудаванні. Неяк так незаўважна атрымалася, што сухагрузы, танкеры, кантэйнеравозы высокай умяшчальнасці і на сучаснай тэхналагічнай базе будуюцца не на верфях у ЗША. У безумоўныя лідары ў гэтай галіне выбіліся вытворцы з Паўднёва-Усходняй Азіі. І Дональд Трамп сур'ёзна занепакоіўся забеспячэннем краіны ўласнымі сродкамі грузаперавозак.

Другі важны пункт — лагістычныя шляхі, па якіх адбываецца рух ключавых таварных патокаў. Што зрабіў прадпрымальны рэспубліканец ледзь не ў першыя тыдні свайго кіравання? Азначыў курс на павелічэнне ўплыву амерыканскага бізнесу ў інфраструктуры Панамскага канала — найважнейшай артэрыі для міжнароднага гандлю. А потым амерыканская кампанія купіла аператара «Паўночнага патоку» — як кажуць, за невялікія грошы. Але навошта нават танныя падводныя трубы, якія не працуюць? На перспектыву. Як бізнесмен, Дональд Трамп думае цалкам лагічна і прагматычна. Канфлікт ва Украіне рана ці позна скончыцца. Наколькі хутка і глыбока адновіцца ўзаемадзеянне Расіі і ЕС — асобнае пытанне. Але тут жа вымалёўваецца іншая цікавая схема: у гандлёвых пагадненнях ледзь не з усімі эканамічнымі партнёрамі гучыць патрабаванне куплі ў ЗША энерганосьбітаў. А валодаючы інфраструктурай, тыя ж Штаты, пры пэўных дамоўленасцях з Расіяй на палітычным і карпаратыўным узроўнях, могуць удзельнічаць у здабычы вуглевадародаў. І прадаваць свой, амерыканскі, газ па трубаправодах у ЕС. У нейкай ступені такое развіццё падзей з'яўляецца не больш чым здагадкай, але абгрунтаванай у сваім патэнцыяле.

Нядаўняе парафіраванне ў Вашынгтоне мірнай дамовы паміж Арменіяй і Азербайджанам таксама носіць яркае лагістычнае адценне. Акрамя іншых кансэнсусаў, прысутнічае і Зангезурскі калідор — ён не проста злучыць Азербайджан з аўтаномнай вобласцю Нахічэвань, а, фактычна, забяспечыць транспартны калідор паміж Каспіем і Чарнамор'ем, або, іншымі словамі, паміж Малой і Сярэдняй Азіяй. А па сутнасці, яго патэнцыял — стаць часткай глабальнага гандлёвага маршруту еўразійскага значэння. Вядома, не заўтра, але ў будучыні карысць ад гэтага праекта вельмі адчувальная. І Белы дом прыклаў значныя намаганні, каб ажывіць гэты праект.

Беларусь — скрыжаванне калі не ўсіх, то многіх еўразійскіх дарог. І да пачатку жорсткай фазы ўкраінскага канфлікту міжнародныя калідоры Поўнач — Поўдзень (з варагаў у грэкі) і Усход — Захад (адно з адгалінаванняў Шаўковага шляху) карысталіся попытам. Драматычныя падзеі ў сусветнай палітыцы знізілі грузапаток, хоць і не спынілі цалкам — але патэнцыял застаўся. У эканоміцы можна многае змяніць і падпарадкаваць, ды трансфармаваць геаграфію немагчыма. І цэнтральнае становішча Беларусі не можа хваляваць прагматыка Дональда Трампа.

Акрамя ўсяго іншага, ён разумее: у краіны ёсць магчымасць стаць варотамі ўзаемадзеяння Захаду і Усходу — асабліва важнага пры перазагрузцы адносін, якая паступова пачынае вызначацца. На ўзроўні бізнесу ў Беларусі, насамрэч, вельмі ндрэнныя сувязі і ў Еўропе, і ў Азіі; і на Поўдні, і на Поўначы. І імідж нашых дзелавых людзей дастаткова высокі. Таму ў 2010-х гадах нямала кампаній з Расіі, Еўропы і іншых тэрыторый альбо выкарыстоўвалі, альбо планавалі выкарыстаць гэты дзелавы патэнцыял нашай краіны для пранікнення на іншыя рынкі — гэты імідж нікуды не сышоў і не выпарыўся. Ён ёсць і застаўся. Іншае пытанне, што рэалізацыя яго ў практычнай плоскасці ўяўляецца не заўсёды магчымай у сілу санкцый — хоць узаемадзеянне працягваецца, няхай і носіць зусім непублічны характар. І гэты патэнцыял можна выкарыстоўваць у новай рэальнасці і нармальнасці. І Дональд Трамп у сваёй утылітарнай палітыцы гэта цудоўна разумее.

**Аляксей КЛІМАЎ.**

## Тым часам

Сустрэча ў Вашынгтоне Прэзідэнта ЗША Дональда Трампа з Уладзімірам Зяленскім і еўрапейскімі лідарамі прайшла з 18 на 19 жніўня па мінскім часе. Ужо ноччу ўсе вядучыя інфармагенцтвы пісалі пра яе правядзенне і вынікі. Журналісты абмяркоўвалі і касцюм Зяленскага, і тое, што Трамп стаў тэлефанаваць Уладзіміру Пуціну, нават не скончыўшы сустрэчу, і размова доўжылася 40 хвілін — пазней яе наяўнасць і працягласць пацвердзіла і прэс-служба Крамля. Па выніках стала вядома, што Зяленскі адмовіўся ад ужо дамоўленага інтэрв'ю тэлеканалу Fox News. Затое інтэрв'ю тэлеканалу даў кіраўнік ЗША, і ўчора бліжэй да вечара па ўсіх інфармацыйных каналах разляцелася галоўная з яго заяў Fox News:

- Зяленскі павінен прадэманстраваць гнуткасць на перагаворах па ўрэгуляванні на Украіне;
- Рашэнні на перагаворах будуць прымаць Пуцін і Зяленскі, ЗША далёкія ад канфлікту;
- Немагчыма як вяртанне Крыма Украіне, так і ўступленне Кіева ў НАТА;
- Трамп запэўніў, што, пакуль ён застаецца на пасадзе Прэзідэнта ЗША, амерыканскіх войскаў на Украіне не будзе;
- Францыя і Германія хочуць размясціць свае сілы ва Украіне, і гэта не створыць праблем з Расіяй;
- РФ — магутная ваенная дзяржава, падабаецца гэта Захаду ці не;
- Гарантыі бяспекі Украіне не могуць уключаць НАТА, але ЗША будуць гатовыя дапамагчы з гэтым Еўропе;
- Трамп ахарактарызаваў як вельмі добрую сваю гутарку з Пуціным па выніках сустрэч з еўрапейцамі і Зяленскім.

ПА СУТНАСЦІ

# РАЗБЛЫТАЦЬ ГОРДЗІЕЎ ВУЗЕЛ



Армагедон адмяняецца. Прынамсі геапалітычны і ядзерны. Пасля сустрэчы на Алясцы да Трампа былі пакліканы генеральны сакратар НАТА, Зяленскі і абойма еўрапалітыкаў. Яны да Трампа былі пакліканыя.
А з Пуціным ён сустракаўся. Улоўлівайце розніцу. А да гэтай лёсавызначальнай сустрэчы амерыканскі лідар патэлефанаваў Лукашэнку. Гэта быў званок, які перапалохаў ліберальную частку Еўропы, яны, у ганарлівай адзіноце і ўсведамленні сваёй... недатычнасці, чакалі сустрэчы на Алясцы. А Прэзідэнт Амерыкі яшчэ і патэлефанаваў Лукашэнку...

Звычайная тэлефонная размова прэзідэнтаў — так, кантакты Першага з сусветнымі лідарамі — не навіна. Набраць Пуціна ці Сі далёка не кожны кіраўнік дзяржавы можа сабе дазволіць — ну, мы да гэтага адносімся звыкла... А тут — іншае. Лукашэнку Трамп патэлефанаваў менавіта перад перагаворамі з расійскім Прэзідэнтам. Гэту сустрэчу назвалі гістарычным самітам, і напярэдадні яго Трамп тэлефануе ў Мінск. Гэта больш чым сімвалічна.

«Наша размова была вельмі добрая. Мы абмеркавалі шмат тэм, у тым ліку візіт Прэзідэнта Пуціна на Аляску. Я з нецярпеннем чакаю сустрэчы з Прэзідэнтам Лукашэнкам у будучыні». Адно паведамленне Трампа ў сацсетцы пераважыла ўсе пытанні, адрасаваныя заходняй медыйнай і экспертнай супольнасцю Мінску. Сваё паведамленне кіраўнік адной з найбуйнейшых эканомік і армій свету пачаў з падкрэслена паважлівай фразы: «У мяне была выдатная размова з глыбокапаважаным Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам», — потым — ужо аб справах: для дзялка і мільярдэра Трампа больш звыкла — адразу аб справах. Не, ён спачатку выказаў павагу — у вялікай палітыцы ніводная коска, ніводная літара невыпадковыя.

Аляска — гэта не пра Украіну. Гэта пошук далейшага суіснавання на планеце. Украіна — толькі штрых у глабальнай архітэктуры планетарнай бяспекі. Мы маглі б стаць крывавым працяжнікам гэтага штрыха — а зараз мы — дзяржава-ініцыятар міру для свету. Мінск уцягнуты ў міратворчы працэс на роўных. Без жэстаў добрай волі з боку Прэзідэнта, без удзелу беларусаў у працэсе абмену палоннымі, без таго інтэрв'ю, падчас якога Першы запэўніў: з Пуціным можна дамовіцца і трэба дамаўляцца, — ці пачаўся б гэты працэс увогуле?

Глыбінная дзяржава ўльтраглабалістаў унутры самой Амерыкі і планетарная — у свеце — белы сцяг не выкінула. Таму Трамп і шукае прыхільнікаў нармальных каштоўнасцяў ва ўсіх кутках. Трамп — прадстаўнік Захаду, але нацыянальна-арыентаваны — гэтым і падобны з Лукашэнкам, Пуціным, Сі. Гэта іх аб'ядноўвае. У свеце час Першых, харызматычных лідараў — а не тых, каму і руку нельга паціснуць. Час Першых — гэта прыкмета перамогі нармальнага, традыцыйнага свету. Час нацыянальных лідараў, чыя задача — каб свет застаўся падзеленым на краіны, а не зоны інтарэсаў транскарпарацый, каб міжнародныя адносіны адпавядалі інтарэсам дзяржаў, а не наднацыянальных інстытутаў. Таму Трамп і шукае саюзнікаў у барацьбе з гэтым сусветным лобі. А сусветнае лобі робіць войны ў самых балючых кропках свету. А з кім размаўляць? Не з тымі ж, хто са зламанай ідэнтычнасцю хоча змяніць свет на замову нейкага істэблішмента.

Пакрысе вымалёўваюцца новыя цэнтры прыцягнення для шматпалярнага свету. Ну, амаль як 80 гадоў назад, калі перамаглі фашызм. А калі прыгледзецца бліжэй, то і геаграфія падобная: Расія, ЗША, Кітай. Беларусь тады стаяла ля вытокаў ААН, была адной з заснавальніц. І сёння яна — не сведка: актыўная саўдзельніца новага светаўладкавання. Так склалася? Не, проста мы выбралі правільную дарогу.

Асаблівая асабістае — беларусацэнтрычнае. Наш шлях самы дакладны: мы самыя блізкія ва ўсіх сэнсах да вялікай Расіі (а сустрэча на Алясцы толькі завяршыла гэтую легітымацыю), мы найбліжэйшыя па шкале адносін з Кітаем. Ну, добра ўсё гэта было, і ёсць. Але зараз наладжваецца дыялог з іншым берагам асноўнага гульца ў светаўладкаванні — з ЗША. Дарэчы, гэта зусім не перашкодзіць нам узмацніць узаемадзеянне і са светам арабскіх інвестыцый.

Еўрапейскі кантынент, які некалі лічыўся эпіцэнтрам сусветнай палітыкі, паступова страчвае свае пазіцыі, ператвараючыся ў поле бітвы інтарэсаў глабальных дзяржаў. Гэта рэзюмавалі і на хельсінкскай канферэнцыі, прысвечанай 50-годдзю АБСЕ.

А зараз уявіце, што магло б быць, калі б не было цяперашняй улады і нас прымусілі б адмовіцца ад нашай мадэлі развіцця. Думаю, за нас бы так не клапаціліся. Прычым, трэба разумець, Прэзідэнт палітычна дасведчаны, але яго ўдзел у геапалітыцы — не дзеля далейшага зацвярджэння палітычнага аўтарытэту, а ўсё для адной мэты — «каб не было вайны» — абараніць беларусаў ад канфліктаў, спыніць вайну ў суседзяў. Беларусь, калі б пайшла па іншым шляху, магла б таксама стаць гордзіевым вузлом еўрапейскага кантынента. Але мы самі дапамагаем разблытваць гордзіевы вузлы сучаснага свету. Але, у адрозненне ад свайго антычнага цёзкі, беларускі лідар прапануе ўсім не секчы з пляча.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# НЯПРОСТАЯ, АЛЕ ВЕЛЬМІ ДОБРАЯ СПРАВА

## У Савеце Рэспублікі адбылася сустрэча з прадстаўнікамі Беларускай асацыяцыі шматдзетных бацькоў

Грамадскае аб'яднанне, створанае 30 гадоў таму, налічвае каля 4 тысяч шматдзетных бацькоў з усіх рэгіёнаў краіны. На добраахвотнай аснове члены асацыяцыі аказваюць сацыяльную, матэрыяльную, іншую дапамогу, у якой маюць патрэбу сем'і, дзе выхоўваецца трое і больш дзяцей. На ўласным прыкладзе яны дэманструюць, што шматдзетнасць — гэта здаровы лад жыцця, усебаковасць інтарэсаў, актыўнасць, выхаванне падрастаючага пакалення ў найлепшых духоўна-маральных традыцыях.



**Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** павіншавала членаў асацыяцыі з юбілейнай датай, выказала ўдзячнасць за тое, што яны не проста прапагандуюць, як правільна выхоўваць дзяцей, а ўласным прыкладам паказваюць, як гэта трэба рабіць.

Па словах спікера, у Беларусі пражывае каля 123 тысяч шматдзетных сем'яў.

**«У многім дзякуючы палітыцы, якая праводзіцца ў нашай краіне, — канстатавала спікер. — Наш Прэзідэнт вялікую ўвагу ўдзяляе гэтаму пытанню, дэмаграфічнай бяспецы. Перш за ўсё, вы ведаеце, якія адносіны ў яго да шматдзетных сем'яў. Усё, што за гэтыя гады зроблена ў нашай краіне для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей, дарагога варта».**

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на тое, што выхаванне дзяцей — самая складаная праца ў свеце. «Гэта вельмі няпростая, але вельмі добрая справа, бо без гэтага няма жыцця на Зямлі», — падкрэсліла Наталля Качанава. Спікер удакладніла ва ўдзельнікаў сустрэчы, якія пытанні хвалююць шматдзетных бацькоў. Абмеркавалі, як можна палепшыць дэмаграфічную сітуацыю ў краіне.

Гэтай тэме сенатары ўдзяляюць асаблівую ўвагу. Трэці год будзе праводзіцца форум «Шчаслівая сям'я — моцная дзяржава», ініцыяваны Саветам Рэспублікі сумесна з Беларускай праваслаўнай царквой. Форум накіраваны на далучэнне грамадства да духоўна-маральных вытокаў, захаванне асноўных сямейных каштоўнасцяў.

Як звярнула ўвагу **старшыня грамадскага аб'яднання «Беларуская асацыяцыя шматдзетных бацькоў» Таццяна КРАЎЧАНКА**, вялізны ўклад у падтрымку шматдзетных сем'яў уносіць дзяржава. «У нас — сацыяльна-арыентаваная краіна, і льгот для шматдзетных вельмі шмат, — падкрэсліла яна. — Практычна няма чаргі на жыллё: на працягу года, калі шматдзетная сям'я становіцца на чаргу, ёй паступае прапанова пабудавацца. Вельмі добра, што жыллё здаецца з аздабленнем. Бо калі раней сям'я атрымлівала адны «сцены», вельмі шмат даводзілася ўкладваць сродкаў для таго, каб прывесці кватэру ў стан прыдатны для жылля. Нават узяць дэкрэтны адпачынак: жанчына можа знаходзіцца ў ім да трох гадоў і на працягу гэтага перыяду атрымліваць «заробак». Шмат пераўтварэнняў у сямейным капітале: цяпер гэтыя грошы можна накіраваць і на будаўніцтва, і на навучанне, і на лячэнне, на іншыя патрэбы. Гэта вельмі істотная падтрымка для шматдзетных сем'яў».

Старшыня грамадскага аб'яднання дадала, што да пачатку новага навучальнага года кожная шматдзетная сям'я атрымала грашовую дапамогу. Не застаюцца без падтрымкі такія сем'і і на працягу года: для навучэнцаў са шматдзетных сем'яў даецца 50-працэнтная льгота на аплату падручнікаў, прадугледжана бясплатнае харчаванне ў школе, на палову зніжаны кошт харчавання ў дзіцячым садку.

«Цяпер шматдзетныя сем'і вельмі добра жывуць, — кажа Таццяна Краўчанка і ўказвае на негатыўную тэндэнцыю, звязаную з тым, што моладзь не спяшаецца нараджаць дзяцей. — Разглядаецца пытанне аб другой бясплатнай спробе ЭКА для сем'яў, у якіх няма дзяцей. Дзяржава ідзе на ўсё, каб мы мелі дзяцей. А дзеці — наша будучыня».

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

# ЗЯЛЁНЫ ШЛЯХ ДА БУДУЧЫНІ

## У Мінскім міжнародным выставачным цэнтры пачала работу III Міжнародная спецыялізаваная экалагічная выстаўка Ecology Expo — 2025

У мерапрыемстве, арганізаваным Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і Нацыянальным выставачным цэнтрам «БелЭкспа», прымаюць удзел больш за 180 кампаній, якія прадставілі такія аспекты экалогіі, як ахова навакольнага асяроддзя, інавацыйныя тэхналогіі, экатурызм і экалагічная адукацыя і асвета. Сярод замежных гасцей — прадстаўнікі Бразіліі, Казахстана, Кітая, Кыргызстана, Манголіі, Расіі, Узбекістана.



Прадстаўнікі навукі і рэспубліканскіх органаў дзяржкіравання, міністэрстваў і ведамстваў з краін блізкага і далёкага замежжа, розных арганізацый і прадпрыемстваў сабраліся на трохдзённую выстаўку, каб абмеркаваць ключавыя пытанні развіцця зялёнай эканомікі, абмяняцца перадавым вопытам і прадэманстраваць дасягненні ў сферы аховы навакольнага асяроддзя.

— Беларусь сёння — цэнтр лёгкіх Еўропы, адзначыў на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця выстаўкі **намеснік Прэм'ер-міністра Беларусі Юрый ШУЛЕЙКА.** — Мы ганарымся тым, што ў нашай краіне пытанні аховы навакольнага асяроддзя прапрацоўваюцца на высокім узроўні.

Ён нагадаў, што ў краіне штогод рэалізоўваецца мноства праграм, звязаных з экалогіяй. Яны датычацца навядзення парадку на зямлі, сартавання і перапрацоўкі смецця, аднаўлення лясной гаспадаркі, азелянення гарадоў і населеных пунктаў і іншага.

Паводле яго слоў, у рамках Ecology Expo — 2025 запланаваны перагаворы, будуць пастаўлены актуальныя задачы.

— Мы з Расіяй абмяркоўваем экалагічную палітыку, якую як краіны-суседкі павінны весці разам доўгія гады, — зрабіў акцэнт намеснік Прэм'ер-міністра. Гэта патрэбна для захавання чысціні нашых тэрыторый для будучых пакаленняў.

Як адзначыў на палях выстаўкі **міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей МАСЛЯК**, такі прадстаўнічы пул удзельнікаў сведчыць аб тым, што цікавасць да выстаўкі высокая. Пацвярджэнне таму — удзел шырокай дэлегацыі партнёраў і сяброў з Міністэрства прыродных рэсурсаў і экалогіі Расіі на рэгіянальным і федэральным узроўнях, прадстаўнікоў іншых краін.

Паводле яго слоў, задача ва ўсіх адна — зберагчы, прымножыць тое, што ў нас ёсць, і перадаць будучаму пакаленню. «Тое, што сёння шмат удзельнікаў прысутнічае на мерапрыемстве, тысячы позіркаў прыкаваны да яго, сведчыць аб тым, што мы з вамі на правільным шляху. Няхай усе тыя інавацыйныя тэхналогіі, якія ў будучыні стануць прымяняцца ў імя развіцця нашай любімай краіны, знойдуць адлюстраванне і на практыцы», — падкрэсліў Сяргей Масляк.

Экатэхналогіі і экатранспарт, экаасяроддзе, экаўпакоўка і экаежа, экатурызм, экалагічная адукацыя і асвета, навуковыя даследаванні ў сферы экалогіі, ахова і рацыянальнае выкарыстанне водных рэсурсаў — кожны з ключавых кірункаў прадстаўлены цікавай экспазіцыяй. Так, экадасягненні і напрацоўкі ўстаноў адукацыі, маладзёжных паслоў Мэт устойлівага развіцця і экаваланцёраў у гульнявой форме дэманструюцца на трох інтэрактыўных пляцоўках. Удзельнікі, госці і наведвальнікі мерапрыемства маюць магчымасць пазнаёміцца з найлепшымі сістэмамі эквавыхавання падрастаючага пакалення, педагагічнымі практыкамі ў галіне экалогіі, актуальнымі падыходамі для прыцягнення дзяцей і моладзі ў экарух і фарміравання ў яго экадружалюбнага ладу жыцця. Джэм з бульбы, рабатызаваная сістэма пасадкі і паліву раслін, біяраскладальная ўпакоўка — гэтыя і іншыя цікавыя распрацоўкі прапанавалі ўдзельнікі рэспубліканскага маладзёжнага праекта «100 ідэй для Беларусі». Рашэнні накіраваны на захаванне і аднаўленне прыроднага асяроддзя, рацыянальнае (устойлівае) выкарыстанне прыродных рэсурсаў і іх узнаўленне, прадухіленне шкоднага ўздзеяння на навакольнае асяроддзе.

Падрыхтавана насычаная дзелавая праграма. У яе рамках пройдзе адкрытае пасяджэнне Кардынацыйнага савета па пытаннях абыходжання з адходамі пры Мінпрыроды, навукова-практычная канферэнцыя аб далейшым развіцці беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў галіне аховы і рацыянальнага выкарыстання трансгранічных водных аб'ектаў, дыялогавая пляцоўка аб негатыўным уздзеянні аховы навакольнага асяроддзя. Запланавана і адкрытая дыскусійная пляцоўка «Трэці ўклад Рэспублікі Беларусь у Парыжскае пагадненне, які вызначаецца на нацыянальным узроўні».

Пройдуць круглыя сталы на тэму фарміравання экалагічнай адказнасці ў бізнесе пры дапамозе сацыяльна-адукацыйных ініцыятыў у рэгіёне, на тэму экатурызму, яго перспектыў і тэндэнцый развіцця. Пытанні лічбавізацыі галіны экалогіі і прыродакарыстання абмяркуюць на адпаведным семінары.

**Аляксандрына ПАРШЫНА**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА**

# АДКАЗНАСЦЬ, ДАСКАНАЛАСЦЬ І СУЧАСНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ












## АД ЗАПУСКУ ДА НАШЫХ ДЗЁН

Сапраўды, за адносна кароткі час завод «БЕЛДЖЫ» стаў адным з ключавых гульцоў беларускай аўтамабільнай галіны. Галоўнае ў гэтай справе — устойлівае развіццё, высокая якасць прадукцыі і стварэнне годных умоў для працаўнікоў. Сучасныя тэхналагічныя рашэнні і акцэнт на сацыяльную адказнасць фарміруюць аснову паспяховай стратэгіі прадпрыемства, якое сёння ўпэўнена глядзіць у будучыню.

Кампанія пачала дзейнічаць у 2017 годзе, а ўжо ў 2018-м дзяржаўная камісія афіцыйна прыняла першыя мадэлі аўтамабіляў. Шлях да поспеху не быў лёгкім: вытворцу прыйшлося пераадольваць шматлікія выклікі: гэта і аб'ектыўныя складанасці ў супрацоўніцтве з партнёрамі, і неабгрунтаваны санкцыйны ціск, што запаволіў пастаўкі камплектуючых... Пераход на ўласны брэнд «БЕЛДЖЫ», што дазволіла павялічыць адказнасць за якасць і развіваць лакалізацыю, таксама быў пэўным выклікам для калектыву. Але ж усё атрымалася. Сёння завод знаходзіцца на фінальнай стадыі першага этапу рэканструкцыі: мадэрнізаваны цэхі афарбоўкі і зваркі.

«Мы імкнёмся да таго, каб наша прадукцыя была даступнай і канкурэнтаздольнай», — адзначыў **генеральны дырэктар СЗАТ «БЕЛДЖЫ» Генадзь СВІДЗЕРСКІ**. Па яго словах, прадпрыемства працуе ў рэжыме пастаяннага ўдасканалення, а тэхналагічнае развіццё — адзін з галоўных прыярытэтаў. Кампанія арыентуецца на тое, каб кожны аўтамабіль, які сходзіць з канвеера, быў не проста таварам, а сімвалам адказнасці перад пакупніком. Гэта значыць — якасць, надзейнасць і сучасныя тэхналогіі: такі падыход дазваляе прадпрыемству не толькі ўпэўнена трымаць заваяваныя пазіцыі, але і працаваць на перспектыву. І сёння кампанія ўспрымаецца не проста як аўтавытворца, але і важная частка беларускай эканомікі, што фарміруе імідж краіны.

## У РЫТМЕ ТЭХНАЛОГІЙ

Генадзь Свідзерскі падкрэслівае, што завод «БЕЛДЖЫ» — максімальна высокатэхналагічная вытворчасць. Так, на пачатку яго дзейнасці тут было 38 робатаў (што на самай справе на той час даволі нямала), зараз статыстыка іншая: у рамках развіцця прадпрыемства з'явіліся: 27 новых робатаў у зварным цэху (у тым ліку лазерная зварка), 10 робатаў у фарбавальным цэху, а таксама адзін робат у цэху зборкі. Увогуле ж цяпер на прадпрыемстве больш за 70 прамысловых робатаў, што дазволіла падвоіць магутнасці. Напрыклад, фарбавальны цэх на сёння можа выпускаць да 120 тысяч аўтамабіляў у год (раней — 60 тысяч). На найбліжэйшую будучыню запланавана будаўніцтва інавацыйнага штамповачнага цэха, а гэта ў сваю чаргу яшчэ больш павысіць якасць прадукцыі.

Падчас размовы з журналістамі Генадзь Свідзерскі расказаў таксама пра планы па пашырэнні мадэльнага раду і павелічэнні вытворчасці.

**У верасні прадпрыемства выведзе на рынак гібрыдны красовер BelGee X80 з запасам ходу больш за 900 кіламетраў, камп'ютарным кіраваннем, функцыяй эканоміі паліва і іншымі «наваротамі». У кастрычніку на рынак выйдзе электрамабіль Geely E22H.**

Як адзначыў генеральны дырэктар прадпрыемства, гэта дастаткова бюджэтны аўтамабіль, даступны па цане, але з добрымі функцыянальнымі магчымасцямі.

Гаворачы аб аб'ёмах вытворчасці, Генадзь Свідзерскі адзначыў, што яны адпавядаюць чаканым паказчыкам. Брэнд паступова нарошчвае сваю прысутнасць на рынку, прычым не толькі на ўнутраным. Увогуле ж, асноўнымі кірункамі продажаў з'яўляюцца: Беларусь (30-35 % ад агульнага выпуску), у нашай краіне марка займае першае месца сярод новых аўтамабіляў; Расія (65-70 %) — там брэнд уваходзіць у топ-6 па папулярнасці; трэці напрамак — краіны ЕАЭС, якія лічацца вельмі перспектыўным рынкам.

**Міхаіл ДАНІЛКОВІЧ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# З АКЦЭНТАМ НА СВАЁ

## Трэба імкнуцца да максімальнай лакалізацыі вытворчых ланцужкоў у рэгіёнах

Такое меркаванне агучыла намеснік міністра эканомікі Алеся АБРАМЕНКА падчас рабочай паездкі ў Ганцавіцкі раён.



Як паведамілі ў прэс-службе Мінэканомікі, намеснік міністра прыняла ўдзел у пасяджэнні раённага выканаўчага камітэта, дзе былі падведзены вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна і выканання бюджэту за першае паўгоддзе, а таксама ацэнена гатоўнасць адукацыйных устаноў да новага навучальнага года.

Пасля чаго Алеся Абраменка наведала шэраг мясцовых прадпрыемстваў, у ліку якіх — «Берасцейскі пекар» Ганцавіцкага хлебазавода, мясцовы лясгас, а таксама філіял РНПЦ трансфузіялогіі і медыцынскіх біятэхналогій, дзе дзякуючы ініцыятыве «Адзін раён — адзін праект» хутка з'явіцца біяфармацэўтычная вытворчасць.

Намеснік міністра абмеркавала з іх кіраўнікамі актуальныя пытанні дзейнасці прадпрыемстваў і планы развіцця, азнаёмілася з ходам рэалізацыі праекта.

— Мы імкнёмся да максімальнай лакалізацыі вытворчых ланцужкоў у рэгіёнах, бо гэта стварае аснову для эканамічнага росту на месцах. Калі ўсе этапы — ад вытворчасці сыравіны да выпуску гатовай прадукцыі — сканцэнтраваны ў межах аднаго раёна, гэта не толькі павышае эфектыўнасць і зніжае лагістычныя выдаткі, але і стымулюе развіццё малога і сярэдняга бізнесу, умацоўвае кадравы патэнцыял, — акцэнтавала яна.

Алеся Абраменка адзначыла, што ключавым аспектам для павышэння якасці і канкурэнтаздольнасці айчыннай прадукцыі з'яўляецца ўкараненне высокіх тэхналогій.

— Важна, каб інавацыі не заставаліся доляй буйных гарадоў і навуковых цэнтраў. Стварэнне біяфармацэўтычнай вытворчасці ў Ганцавічах — прыклад таго, як інавацыі могуць стаць драйверам рэгіянальнага развіцця. Праект рэалізуецца з выкарыстаннем кітайскіх высокіх тэхналогій, падобных да якіх няма ў нашай краіне і на прасторы СНД. Выхад прадпрыемства на праектную магутнасць дасць магчымасць не толькі забяспечваць попыт унутранага рынку, але і экспартаваць прадукцыю, — рэзюмавала Алеся Абраменка.

# ЯКАСЦЬ ПЕРШ ЗА ЎСЁ

## Ці ўсё добра ў крамах, якія гандлююць таварамі лёгкай прамысловасці?

Гэтым пытаннем задаліся спецыялісты і вырашылі высветліць адказ на яго. Як патлумачылі ў профільным міністэрстве, у сілу ўскладзеных паўнамоцтваў падатковымі органамі праводзіцца пастаянная работа па выяўленні і спыненні парушэнняў у розных сферах прадпрымальніцтва, у тым ліку сферы рознічнага гандлю таварамі лёгкай прамысловасці.

Бо такія тавары — шырокага спажывання, і ў першую чаргу гэта адзенне, абутак, тэкстыль, вырабы са скуры і футра.



— У пагоні за нізкай цаной пакупнікі часам не звяртаюць увагу на якасць набытых тавараў, на наяўнасць плацежнага дакумента, каб у наступным абараніць свае правы як спажыўца, не кажучы ўжо пра наяўнасць на тавары неабходнай маркіроўкі — сродкаў ідэнтыфікацыі, — адзначылі ў МПЗ.



Дарэчы, пералік тавараў, якія падлягаюць маркіроўцы сродкамі ідэнтыфікацыі, устаноўлены адпаведнай пастановай Саўміна. Да такіх тавараў у тым ліку адносяцца абутак, прадметы адзення, бялізна пасцельная, сталовая і іншыя тавары.

— У рамках падатковага кантролю за суб'ектамі гаспадарання, якія ажыццяўляюць рэалізацыю тавараў лёгкай прамысловасці, у тым ліку ў крамах «нізкага» цэнавага сегмента, падатковымі органамі ў першым паўгоддзі 2025 года праверany шэраг суб'ектаў гаспадарання, якім прад'яўлены падатковыя абавязацельствы на значную суму, — расказалі ў міністэрстве.

Тут дадалі, што да адміністрацыйнай адказнасці ў выглядзе штрафу прыцягнута больш за 120 вінаватых асоб.

— Пры гэтым больш за 50 % устаноўленых парушэнняў прыпадае на парушэнні парадку прыёму сродкаў плацяжу і патрабаванняў заканадаўства аб маркіроўцы тавараў сродкамі ідэнтыфікацыі. Высветлена сума схаванай ад падаткаабкладання наяўнай выручкі ў памеры больш за 11 мільёнаў рублёў, а таксама адсутнасць дакументаў, якія пацвярджаюць набыццё (паступленне) тавараў, — канстатавалі ў ведамстве.

Тут таксама звярнулі ўвагу, што адначасова на кантролі знаходзяцца пытанні выплаты падаткаў з утоенай ад падаткаабкладання выручкі і паўнаты выплаты падатку на дабаўленую вартасць, які спаганяецца падатковымі органамі пры ўвозе тавараў на тэрыторыю Беларусі з тэрыторыі дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза.

Трэба сказаць, што ў рамках прафілактычнай работы, якая ладзіцца, праведзена 22 маніторынгі. Па выніках накіраваных у рамках камеральнага кантролю апавяшчэнняў, у якіх прапанавана добраахвотна ліквідаваць парушэнні, суб'ектамі гаспадарання прадстаўлены ўдакладненыя падатковыя дэкларацыі (разлікі) і добраахвотна вылічаны і выплачаны падаткі.

У ведамстве заверылі, што мерапрыемствы падатковага кантролю ў сферы гандлю таварамі лёгкай прамысловасці будуць працягнутыя.


**Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА**

**Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 120/С-15908 (наименование: столярный цех; назначение: здание обрабатывающей промышленности иного назначения), площадью 424,6 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Берёзовский р-н, г. Берёза, ул. Ленина, 100, на земельном участке с кадастровым номером 120850100001002809, площадью 0,3581 га, составные части и принадлежности: четыре пристройки**

| Начальная цена, руб. (без учета НДС) | 51 450,00 | Размер задатка, руб. | 5 145,00 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Теплоприбор», 225209, Брестская обл., г. Береза, ул. Ленина, 100, 80164341970. **Организатор торгов:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Брест, ул. Наганова, 10-329, тел./ф 80162408701. Задаток вносится на расчетный счет Организатора аукциона до подачи заявления. **Р/с для перечисления задатка:** р/с BY32BAPB30127866600100000000, в ОАО «Белагропромбанк» ЦБУ № 116 в г. Брест, РД по Брестской области, код банка BAPBBY2X, УНП 201028245, код платежа – 40901. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона. **Условия оплаты:** согласно заключенному договору купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает Продавцу НДС в размере 20 % от стоимости продажи объекта, а также в течение 3 рабочих дней со дня аукциона возмещает фактические затраты на организацию и проведение аукциона, включающие вознаграждение Организатора аукциона. **Срок возможного отказа от проведения аукциона:** не позднее чем за 3 календарных дня до наступления даты проведения аукциона. **Шаг аукциона:** 5 % от предыдущей названной цены

**Аукцион состоится 04 сентября 2025 г. в 14.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо предоставить для участия в аукционе, порядок, в соответствии с которым проводится аукцион, а также иная информация содержатся на сайте Организатора аукциона **www.ocenkabrest.by,** а также можно узнать по телефонам: **8 (0162) 40-87-01, 40-87-41**

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 03 сентября 2025 г. до 17.00**



**ИЗМЕНЕНИЯ И ДОПОЛНЕНИЯ В ПРОЕКТНЫЕ ДЕКЛАРАЦИИ**

**по объекту строительства «Застройка микрорайона «Лошица-9» (2-я очередь). Жилой дом № 14 по генплану»**

В опубликованные 11 декабря 2024 года и 19 апреля 2025 года в газете «Звязда» № 241 и № 77 проектные декларации (по объекту строительства «Застройка микрорайона «Лошица-9» (2-я очередь). Жилой дом № 14 по генплану») внести следующие изменения и дополнения:

1. В таблице раздела «Характеристика объекта» изменить стоимость 1 м² при подаче дольщиками заявлений с 28.08.2025 по 01.12.2025 (включительно) на создание объектов долевого строительства на:

**- тридцать трехкомнатных квартир** общей площадью 98,06 м² (№№ 1, 6, 10, 14, 18, 22, 26, 30, 34, 38, 116, 122, 126, 130, 134, 138, 142, 146, 150, 154, 156, 162, 166, 170, 174, 178, 182, 186, 190, 194):

- при 100 % оплате 3 550,00 за 1 м²;
- при рассрочке платежей 3 650,00 за 1 м²;

**- две четырехкомнатные квартиры** общей площадью 120,58 м² (№ 3 и № 42):

- при 100 % оплате 3 500,00 за 1 м²;
- при рассрочке платежей 3 550,00 за 1 м².

2. Второй абзац раздела «Порядок приема заявлений от граждан, желающих принять участие в долевом строительстве квартир» дополнить предложением:

«Прием заявлений для заключения договоров создания объектов долевого строительства на **тридцать трехкомнатных квартир** общей площадью 98,06 м² (№№ 1, 6, 10, 14, 18, 22, 26, 30, 34, 38, 116, 122, 126, 130, 134, 138, 142, 146, 150, 154, 156, 162, 166, 170, 174, 178, 182, 186, 190, 194) и **две четырехкомнатные квартиры** общей площадью 120,58 м² (№ 3 и № 42) будет осуществляться в ходе личного приема и в порядке живой очереди по адресу: г. Минск, пр-т Жукова, 6, кабинет № 1 (отдел реализации недвижимости ОАО «МАПИД», телефоны для справки: 209-87-32, 209-87-52) **с 9.00 28.08.2025** до момента набора необходимого количества заявлений, но не позднее 1 декабря 2025 года».

УНП 100008115



**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже движимого имущества**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов **№ 2025.Г.002.00185** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by/.

**Продавец:** Инспекция Министерства по налогам и сборам Республики Беларусь по Минскому району. 220140, г. Минск, ул. Притыцкого, 90, тел.: 8 017 3592000.

